Беларускі Дзяржаўны Універсітэт 1921

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 25 сакавіка 1999 года, чацвер, № 6 (1798)

МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

## ДОБРЫЯ ІДЭІ ДОБРА ПРАДАЮЦЦА

Распрацоўка навукоўцаў Навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем БДУ, над якой яны шчыравалі цэлых дзесяць гадоў, нарэшце зможа быць рэалізаванай у вытворчасці. Укласці свае сродкі ў арганізацыю гэтага працэса пагадзіўся нямецкі прадпрымальнік Вольфганг Вінклер.

Самай галоўнай перадумовай ажыццяўлення свайго інвестыцыйнага праекта менавіта ў Беларусі дырэктар прыватнай акадэміі "Сімсан" Вольфганг Вінклер назваў чалавечы фактар. Сваю зацікаўленасць у распрацоўцы навукоўцаў БДУ спадар Вінклер выказаў яшчэ ў 1993 годзе, калі ў Мінску адбыўся міжнародны семінар "Баварыя-Беларусь". Яго арганізатарамі выступалі Вышэйшая тэхнічная школа Вюрцбург-Швайнфурт (Германія) і Белдзяржуніверсітэт. Каля 25 бізнесменаў, зацікаўленых у працы на беларускім рынку, прыбылі ў Беларусь для ўстанаўлення кантактаў з патэнцыйнымі партнёрамі і абмеркавання перспектыў будучага супрацоўніцтва. З беларускага боку ў семінары прымалі ўдзел міністэрствы і ведамствы, а таксама каля 30 разнастайных прадпрыемстваў.

На той час у рамках рэспубліканскай праграмы "Зварка" беларускімі навукоўцамі быў распрацаваны такі вадкакрышталічны мадулятар, які адпавядаў усім еўрапейскім стандартам, па параметрах не саступаў узорам сусветна вядомых фірмаў і нават пераўзыходзіў іх па ступені абароны.

Ужо тады падчас наведвання НДІ ПФП нашага універсітэта спадар Вінклер заявіў аб гатоўнасці купіць 1000 спецыяльных масак для абаронных шлёмаў, якія выкарыстоўваюцца пры зварцы. Укараненне ў вытворчасць навуковай распрацоўкі БДУ дазволіла б рабіць абаронныя маскі з меншым сабекоштам і з найменшымі пабочнымі тратамі ў адрозненне ад заходніх аналагаў. Але прадукт існаваў у адзіным экземпляры. Нямецкі бок адразу ж зрабіў прапанову аб наладжанні вытворчасці ў Беларусі з наступным продажам тавару на сусветных рынках. Танныя камплектуючыя дэталі маглі пастаўляцца з Германіі. Акадэмія "Сімсан" гатова была выдзеліць неабходныя інвестыцыі. З таго часу прамінула шэсць гадоў. Але, як высвятлілася, гэтая навуковая распрацоўка не згубіла сваёй актуальнасці і дагэтуль.

*(Працяг на 4-й стар.).*

АД ПЕРШАЙ АСОБЫ

## Усё маё жыццё – гэта універсітэт



***КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ МІНСКАГА ГАРАДСКОГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПА КУПАЛАЎСКАЙ АКРУЗЕ № 9 ІГАР ВЯРЭНЧЫКАЎ***

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ Ігар Раманавіч Вярэнчыкаў — цяпер намеснік прарэктара БДУ па сацыяльных пытаннях, дырэктар студгарадка, дацэнт кафедры крыміналістыкі юрфака. Сапраўды, як прызнаўся сам Ігар Раманавіч, універсітэт — гэта ўсё яго жыццё. Акрамя таго, Ігар Раманавіч Вярэнчыкаў – кандыдат у дэпутаты Мінскага гарадскога савета дэпутатаў па Купалаўскай акрузе № 9. Інтэрв'ю з ім пра тое, чым жыве цяпер студгарадок, якому, дарэчы, не так даўно споўнілася 25 гадоў, чытайце на 2-й старонцы нумара.

ГЕРОЙ НАШАГА ЧАСУ

## ВЫРАШАЦЬ ПРАБЛЕМЫ БУДЗЕМ РАЗАМ

***КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ МІНСКАГА ГАРАДСКОГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПА ГРУШАЎСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ № 16 РУСЛАН МАКАРСКІ***

Студэнт факультэта радыёфізікі і электронікі Руслан Макарскі ўжо даўно займаецца грамадскай працай. "Чым болей праблем вырашаў, тым больш дакладна ўяўляю сабе, што трэба рабіць, каб студэнты маглі нармальна вучыцца і нармальна жыць", — гаворыць Руслан. Цяпер ён камендант і старшыня студсавета інтэрната БДУ № 10. Працоўны калектыў факультэта вылучыў Руслана Макарскага кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадскога савета дэпутатаў па Грушаўскай выбарчай акрузе № 16.



Больш падрабязна пазнаёміцца з героем нашага часу вы можаце на 3-й старонцы нумара.

# Ігар Раманавіч ВЯРЭНЧЫКАЎ:
# “УСЁ МАЁ ЖЫЦЦЁ – ГЭТА УНІВЕРСІТЭТ”

*З нашага дасье: Ігар Раманавіч Вярэнчыкаў — намеснік прарэктара Белдзяржуніверсітэта па сацыяльных пытаннях, дырэктар студэнцкага гарадка, дацэнт кафедры крыміналістыкі юрыдычнага факультэта. Галіна навуковых інтарэсаў — крыміналістычная прафілактыка.*

*Раней быў студэнтам юрыдычнага факультэта БДУ, потым аспірантам кафедры крыміналістыкі, сакратаром камітэта камсамола факультэта і намеснікам сакратара камітэта камсамола універсітэта па працоўным выхаванні.*

**— Ігар Раманавіч, як вядома, сапраўдным студэнтам можна назваць таго, хто хаця б некаторы час жыў у інтэрнаце, навучыўся быць самастойным, змагацца і атрымліваць перамогі ў гэтым нялёгкім і ўжо амаль дарослым жыцці. Раскажыце пра гэты асаблівы свет студэнцкага гарадка.**



— Зараз у нас пражывае больш за 5 тысяч студэнтаў. Гэта і студэнты бюджэтнай формы навучання, і платнікі, і сямейныя, і аспіранты, а таксама замежныя студэнты. Трэба сказаць, што БДУ — адна з нешматлікіх вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі, у якой практычна на сто працэнтаў вырашана пытанне з пражываннем для іншагародніх. Яшчэ не было выпадку, каб мы некаму адмовілі, хаця часам і даводзіцца парушаць некаторыя сантэхнічныя нормы, засяляючы на тыя ж квадратныя метры, скажам, не двух, а трох студэнтаў. Але, як правіла, студэнты да гэтага ставяцца з разуменнем, бо жыць трэба ўсім, а здымаць кватэру ў сталіцы зараз далёка не кожнаму па кішэні.

Комплекс студэнцкіх інтэрнатаў Белдзяржуніверсітэта з'яўляецца сёння самым буйным у Беларусі і па-ранейшаму застаецца адным з лепшых.

Аднак гэты “вялікі горад” патрабуе пастаянна вялізных затрат для падтрымання яго ў працоўным стане. Цяпер у эксплуатацыі гарадка 8 інтэрнатаў. Адзін з самых лепшых — інтэрнат № 10 на вуліцы Курчатава, які мы закончылі будаваць якраз да пачатку гэтага навучальнага года.

**— Скажыце, а як арганізаваны адпачынак і вольны час студэнтаў, якія жывуць у гарадку?**

— Практычна пры кожным інтэрнаце ў нас ёсць трэнажорныя залы “Кетлер”, разнастайныя спартыўныя секцыі. Кожнае свята: ці то Новы год, ці то 8 Сакавіка, ці то Дзень смеху — у кожным інтэрнаце праводзяцца дыскатэкі, шоў-праграмы, конкурсы. Вось нядаўна выбралі “Міс Вясну” сярод чароўных дзяўчат-студэнтак. Зараз плануем правесці ўжо традыцыйнае і вядомае свята прыгажосці “Міс БДУ”. Дарэчы, з прызамі і ўзнагародамі нам заўжды дапамагае наш Апякунскі савет.

**— А што гэта за арганізацыя і чым канкрэтна яна займаецца?**

— Апякунскі савет створаны пры студгарадку ў мінулым годзе — гэта наш пастаянны спонсар у многіх пачынаннях. Членам яго можа стаць як фізічная асоба, так і арганізацыя. Уступны ўзнос зусім невялікі — 0,5 мінімальнай заработнай платы (на сёння гэта складае ўсяго 250.000 рублёў). Асноўнымі накірункамі дзейнасці аб'яднання з'яўляецца арганізацыя выхаваўчага працэсу са студэнтамі, дапамога студэнтам-сіротам, са шматдзетных сем'яў, маламаёмным у станаўленні, матэрыяльная падтрымка іх, заахвочванне найбольш актыўных студэнтаў, заахвочванне розных конкурсаў і спаборніцтваў. Напрыклад, з намі супрацоўнічае стаматалагічная фірма “Джанатан”, якая аказвае бясплатныя стаматалагічныя паслугі студэнтам-сіротам, а таксама бясплатна праводзіць агляд і кансультацыю ўсіх студэнтаў БДУ, а лечыць іх па расцэнках, зніжаных на 30 %. Пры спансіраванні Апякунскага савета мы набылі дарагое якаснае абсталяванне для дыскатэк, пастаянна абнаўляем фанатэку. Кафэ “Дабрына”, таксама член нашага савета, бясплатна корміць студэнтаў-сірот. Вось цяпер Апякунскі савет абвясціў конкурс на лепшы пакой інтэрната. Самым чыстым і акуратным студэнтам, у якіх у пакоі сапраўдная хатняя ўтульнасць, — тэлевізар у падарунак.

**— Я чула ад сваіх пецярбургскіх сяброў, студэнтаў інтэрната, што ў іх там проста кашмар і кавардак, пастаянныя папойкі, анашу і гераін распаўсюджваюць прама праз пакоі-цэнтры. А ці спакойна з гэтым у вашым гарадку?**

— Дзякуй Богу, наркотыкі у нас пакуль не зафіксаваны. Мы ўсімі сродкамі імкнемся папярэдзіць студэнтаў, патлумачыць ім усю мярзоту наркаманіі, каб не даводзіць да граху.

Хаця бываць часам эксцэсы. Напрыклад, адзін студэнт здаў нейкую старую запазычанасць і на радасцях вырашыў спаліць канспект, але крыху перабраў. Другі студэнт стаў дапамагаць яму і, дастаўшы вогнетушыцель, стаў тэрмінова заліваць усё гэта. У выніку прыйшлося перафарбоўваць нядаўна пафарбаваныя сцены. Хочацца, каб студэнты, нарэшце, забыліся на гэты ўтрыманскі комплекс “нам нешта павінны, студгарадок нешта зробіць”. Час быць дарослымі і адносіцца да інтэрната як да свайго роднага дома, сапраўды, менавіта домам большасць студэнтаў называе інтэрнат на працягу доўгага часу свайго жыцця.

**— Ігар Раманавіч, а якія планы ў студгарадка?**

— Галоўнае, каб студэнты таксама актыўна ўключыліся ў работу і каб у нашых узаемаадносінах заўсёды было разуменне і падтрымка. Мы плануем стварыць пральны комплекс, каб значна знізіць затраты на сцірку бялізны. Сюды ж можна аднесці і капітальны рамонт нашых інтэрнатаў. Рэалізацыя многіх задумак дазволіць стварыць нармальныя ўмовы для жыцця студэнтаў.

У гэтым годзе студэнцкі гарадок Белдзяржуніверсітэта адзначае сваё 25-годдзе. За чвэрць стагоддзя ў гарадку жылі дзесяткі тысяч студэнтаў нашай краіны, зараз ужо дарослых першакласных спецыялістаў. І ўжо іх дзеці-студэнты жывуць у тых пакоях і ўліваюцца ў гэтае захапляльнае студэнцкае жыццё. Як сказаў Ігар Раманавіч пра сябе: “Усё маё жыццё — гэта універсітэт”.



Дарэчы, Ігар Раманавіч Вярэнчыкаў быў вылучаны кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадскога савета дэпутатаў па Купалаўскай акрузе № 9. Ён пагадзіўся, таму што лічыць — працаваць з моладзю патрэбна. Важна правільна расставіць прыярытэты. Гэта, у першую чаргу, стварэнне цэласнай сацыяльнай інфраструктуры культурнага адпачынку, адукацыйныя праграмы, дапамога моладзі ў працаўладкаванні, пашырэнне партнёрскіх і замежных сувязей з прыцягненнем розных маладзёжных арганізацый, зацікаўленых асоб і выпускнікоў БДУ.

*Гутарыла С. НАРЭЙКА*

ДОШКА АБ'ЯЎ

Нацыянальны цэнтр фізікі часціц і высокіх энергій (НЦ ФЧВЭ) аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады загадчыка лабараторыі фізікі часціц.

Кваліфікацыйныя патрабаванні: вучоная ступень доктара альбо кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац, вопыт навуковай і арганізатарскай работы не менш за 10 гадоў.

*Тэрмін падачы дакументаў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*
*Тэл. для даведак 232-60-34.*

**Навукова-даследчы інстытут фізіка-хімічных праблем Белдзяржуніверсітэта аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад**

— старшага навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі кандэнсаваных асяродкаў;

— малодшага навуковага супрацоўніка лабараторыі біяхіміі лекавых прэпаратаў.

*Тэрмін падачы дакументаў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*
*Дакументы прымаюцца па адрасе: 220050, г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, аддзел кадраў НД ФХП БДУ.*

ГЕРОЙ НАШАГА ЧАСУ

# ВЫРАШАЦЬ ПРАБЛЕМЫ БУДЗЕМ РАЗАМ

Перада мной сядзіць чалавек, якога я ведаю ўжо паўгода як звычайнага студэнта факультэта радыёфізікі і электронікі Белдзяржуніверсітэта. Але зараз у нашай гутарцы некалькі афіцыйны тон: на стале працуе дыктафон, а Руслан Макарскі адказвае на мае пытанні. Перад пачаткам размовы я вырашыў азнаёміцца з біяграфіяй Руслана.

Нарадзіўся ў 1977 годзе. Беларус. Жанаты. Закончыў школу з залатым медалём. У 1994 годзе паступіў у Белдзяржуніверсітэт на факультэт радыёфізікі і электронікі. Другая вышэйшая адукацыя — эканаміст-менеджэр.

— Я даўно заўважыў вельмі дзіўную асаблівасць, — нечакана хутка мяняе тэму Руслан. — Вельмі часта высокакласныя спецыялісты, якія вырашылі звязаць сваё жыццё з навукай, у іншых галінах выглядаюць проста наіўнымі і бездапаможнымі. Сёння такое можна сустрэць амаль на кожным кроку. Для сябе я вырашыў ліквідаваць гэты прабел і атрымаць другую вышэйшую адукацыю — эканаміста. Радыёфізіка і электроніка — гэта добра, але калі ведаеш эканамічныя асновы работы галіны, гэта дае дадатковую ўпэўненасць у заўтрашнім дні.

Займаўся навуковай работай — удзельнічаў у міжнародным праекце "Мадэліраванне колеру ў алмазных структурах" у НДІ прыкладных фізічных праблем імя А.Н. Сеўчанкі. Зараз працуе ў Цэнтральным НДІ тэхнікі кіравання, дзе займаецца распрацоўкай інфармацыйна-аналітычных сістэм кіравання прадпрыемствам.

— Веды, якія даў мне універсітэт, рэальна дапамагаюць сёння многім прадпрыемствам выжыць. Калі гэта бачыш, расце вера ў нармальнае будучае нашай краіны. У нас сёння ёсць усе перадумовы, каб гэтага дасягнуць. Патрэбны проста час для таго, каб кожны пачаў працаваць на сваім месцы добра.

Вось так проста і ўпэўнена. Упэўненасці майму суразмоўцу дадае і добрая фізічная форма. Руслан — неаднаразовы пераможца гарадскіх спаборніцтваў па гіравым спорце і армрэслінгу.

На пытанне, ці не вагаўся, калі вырашыў стварыць сям'ю: сёння ж маладой пары даводзіцца сутыкацца з лавінай праблем і цяжкасцей, — адказ паследаваў вельмі хутка.



— Я моцна кахаю сваю жонку і пры любых абставінах зрабіў бы так, як зрабіў. Дарэчы, мая жонка — таксама студэнтка факультэта радыёфізікі і электронікі БДУ.

Добра ведаюць Макарскага і па грамадскай рабоце.

— З чаго ўсё пачалося? — смяецца ён. — Ды проста ўсё пачалося. Быў старастай паверха ў трэцім інтэрнаце. Потым стаў старшынёй студэнцкага савета. Чым болей праблем вырашаў, тым больш дакладна ўяўляў сабе, што трэба рабіць, каб студэнты маглі нармальна вучыцца і нармальна жыць. У мінулым годзе стаў намеснікам старшыні Студэнцкага саюза БДУ. Гэта новая грамадская арганізацыя, з якой у мяне звязана многа надзей. Але ўжо сёння мы займаемся такой неабходнай работай па адаптацыі студэнтаў, асабліва 1-2 курсаў, да універсітэцкага жыцця. Акрамя таго, дапамагаем з працаўладкаваннем. Наша дзейнасць выходзіць за межы БДУ. У нас добрыя адносіны з ветэранскімі арганізацыямі Мінска, пачынаем супрацоўніцтва з дзіцячымі дамамі. Я вельмі спадзяюся, што і надалей захаваем такі ж тэмп.

Я ж ведаю яшчэ і пра тое, што пры непасрэдным удзеле Руслана Макарскага ў тэрмін быў здадзены ў эксплуатацыю інтэрнат № 10 па вул. Курчатава. Гэта менавіта ён арганізаваў будаўнічую брыгаду са студэнтаў. Цяпер ён камендант і старшыня студсавета гэтага інтэрната. Тыя, хто жыве ў філіяле БДУ, зразумеюць мяне, калі я пералічу такія "дробязі", як будаўніцтва дарогі, вулічнае асвятленне, работа дакладна па графіку аўтобуса № 47, устаноўка міжгародніх тэлефонаў-аўтаматаў. І тут не абышлося без Макарскага. З амаль 2000 чалавек, якія пражываюць у трэцім і дзесятым інтэрнатах, мала хто ведае аб гэтым чалавеку. Для многіх стала нечаканасцю, калі працоўны калектыў факультэта вылучыў Руслана Рыгоравіча Макарскага кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадскога савета дэпутатаў па Грушаўскай выбарчай акрузе № 16.

— Ведаеце, я навучыўся адстойваць інтарэсы тых людзей, якія мне давяраюць. Ва ўсіх нас многа агульных праблем. Чаму гэтыя праблемы нам не вырашаць разам?

Не магу не пагадзіцца з маім суразмоўцам. Хочацца пажадаць яму толькі поспехаў ва ўсіх пачынаннях.

*Юрый ВІКТАРОВІЧ*

# АЛІМПІЯДА "АБІТУРЫЕНТ ЛІЦЭЯ БДУ-99"

Ліцэй Белдзяржуніверсітэта праводзіць алімпіяды па наступных дысцыплінах: матэматыка, фізіка, хімія, беларуская мова, руская мова.

Пераможцы алімпіяды "Абітурыент Ліцэя БДУ-99" маюць права залічэння ў 10 клас Ліцэя БДУ без уступных экзаменаў на адпаведныя спецыяльнасці.

У алімпіядзе могуць прымаць удзел усе навучэнцы 9-х класаў сярэдніх школ Рэспублікі Беларусь.

У залежнасці ад абранага профілю І тур алімпіяды праводзіцца:

па беларускай мове —10 красавіка (дыктоўка);

на рускай мове —17 красавіка (дыктоўка);

па хіміі — 11 красавіка (пісьмова);

па фізіцы — 18 красавіка (пісьмова);

па матэматыцы — 25 красавіка (пісьмова).

Пачатак І тура алімпіяды па рускай і беларускай мовах, хіміі і фізіцы — у 10.00 у Ліцэі БДУ. Рэгістрацыя ўдзельнікаў будзе адбывацца ў Ліцэі БДУ з 8.30 да 9.45 у дзень правядзення І тура.

І тур алімпіяды па матэматыцы адбудзецца ў галоўным корпусе БДУ (інфармацыя аб аўдыторыі будзе паведамляцца дадаткова) у 10.00. Рэгістрацыя ўдзельнікаў — за паўтары гадзіны да пачатку пісьмовай работы ў галоўным корпусе БДУ.

Жадаючым прыняць удзел у алімпіядзе неабходна падаць заяўку па тэлефоне ў Мінску 221-06-01 з 11.00 да 17.00 ці па адрасе: 220006, г. Мінск, вул. Маякоўскага, 96, каб. 100, "Алімпіяда".

У заяўцы неабходна ўказаць прадмет, прозвішча, імя, горад, нумар школы. Прыём заявак па тэлефоне ці ў пісьмовай форме спыняецца за адзін дзень да правядзення І тура.

Удзельнікам алімпіяды неабходна мець пры сабе ручку, 50 000 рублёў (арганізацыйны ўзнос), даведку са школы з наклееным фотаздымкам, завераную школьнай пячаткай, што прад'яўнік з'яўляецца навучэнцам 9 класа.

# ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ Ў ЛІЦЭЙ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА НА 1999 ГОД

У ліцэй БДУ прымаюцца навучэнцы, якія скончылі 9 класаў агульнаадукацыйнай школы, для працягу навучання ў 10-11 класах па наступных профілях: **фізічны, радыёфізічны, матэматычны, хімічны, хіміка-біялагічны, філалагічны, гістарычны.** Набор у Ліцэй (3 гуманітарныя і 7 прыродазнаўчанавуковых класаў па 20 чалавек) праходзіць шляхам правядзення агульнаадукацыйнага тэста (пісьмова) і конкурсных уступных экзаменаў з 15.06 па 28.06.1999 года.

Парадак правядзення экзаменаў:

Агульнаадукацыйны тэст праводзіцца перад экзаменамі. Тэст ацэньваецца залік/незалік. Абітурыенты, якія атрымлiваюць незалік, не дапускаюцца да здачы экзаменаў.

Пералік экзаменаў па профілях:

фізічны і радыёфізічны: фізіка (вусна і пісьмова), матэматыка (пісьмова);

матэматычны: матэматыка (вусна і пісьмова), фізіка (пісьмова);

хімічны: хімія (вусна і пісьмова), матэматыка (пісьмова);

хіміка-біялагічны: хімія (пісьмова), матэматыка (пісьмова), біялогія (вусна);

філалагічны: беларуская мова (дыктоўка), руская мова і літаратура (тэст), беларуская літаратура (вусна);

гістарычны: сусветная гісторыя і гісторыя Беларусі /навейшы час/ (тэст), гісторыя Беларусі (вусна), беларуская або руская мова (дыктоўка).

Абітурыенты, якія атрымалі адзнаку "2", да здачы наступных экзаменаў не дапускаюцца.

Без уступных экзаменаў у Ліцэй прымаюцца:

*пераможцы Рэспубліканскай алімпіяды (дыпломы I, II, III ступені) па наступных прадметах: у матэматычныя класы — па матэматыцы, у фізічны і радыёфізічны класы — па фізіцы, у хімічны клас — па хіміі, у хіміка-біялагічны клас — па хіміі ці біялогіі, у філалагічны клас — па рускай ці беларускай мове;

*пераможцы Рэспубліканскай алімпіяды "Абітурыент Ліцэя" (праводзіцца ў красавіку).

Пераможцы Рэспубліканскай алімпіяды па інфарматыцы, што паступаюць у матэматычны клас, якія атрымалі залік па агульнаадукацыйным тэсце, здаюць экзамен па матэматыцы (пісьмова). Пры атрыманні адзнак "5" ці "4" яны залічваюцца па-за конкурсам, пры атрыманні адзнакі "3" — здаюць астатнія экзамены і ўдзельнічаюць у агульным конкурсе.

Пераможцы Рэспубліканскай алімпіяды па гісторыі, што паступаюць у гістарычны клас, якія атрымалі залік па агульнаадукацыйным тэсце, вызваляюцца ад тэста па сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі (навейшы час) з выстаўленнем адзнакі "5". Астатнія экзамены здаюцца на агульных падставах.

Пераможцы Рэспубліканскай алімпіяды па прадметах, якія не з'яўляюцца прафілюючымі на дадзеную спецыяльнасць, здаюць экзамены і ўдзельнічаюць у агульным конкурсе з атрыманнем аднаго дадатковага бала.

Дакументы прымаюцца з 10 мая па 10 чэрвеня 1999 года. Для ўдзелу ў экзаменах неабходны наступныя дакументы: заява на імя дырэктара, медыцынская даведка (форма 086/у), 6 фотаздымкаў 3х4, выпіска аб адзнаках за 1-3 чвэрць 9-га класа.

На час навучання ў Ліцэі іншагароднім прадастаўляецца інтэрнат. На час здачы экзаменаў інтэрнат не прадастаўляецца.

Навучанне ў Ліцэі бясплатнае.

Выпускнікі Ліцэя 1999 года, якія маюць атэстат без троек, карыстаюцца ільготамі медалістаў агульнаадукацыйных школ пры паступленні ў БДУ.

У Ліцэі існуе такая форма платнага навучання, як "Вечаровы Ліцэй", для навучэнцаў 8-11 класаў для паглыбленага вывучэння асобных прадметаў.

Наш адрас: г. Мінск, вул. Маякоўскага, 96, тэл. 221-04-10, 221-06-01.

МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

# ДОБРЫЯ ІДЭІ ДОБРА ПРАДАЮЦЦА

*(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).*

На гэты раз Вольфганг Вінклер наведаў БДУ разам са сваімі партнёрамі: Хансам Шрэдэрам — камерцыйным дырэктарам фірмы "Wuekro-elektronic", якая спецыялізуецца на вытворчасці электроннага абсталявання для навукова-даследчых дабараторый і навучальных устаноў, і Карлам Кохам — камерцыйным дырэктарам фірмы "Kukel", якая працуе ў галіне вытворчасці станкоў і прамысловых установак. Мэта візіту — канкрэтызаваць палажэнні праекта і пераправерыць наяўныя магчымасці для наладжвання вытворчасці. Дарэчы, сёння ў Беларусі ніводнаму з прадпрыемстваў не выгодна займацца вырабам падобнай прадукцыі: патрэба рэспублікі ў абарончых масках для зварачнай тэхнікі значна ніжэй, чым аб'ёмы вытворчасці, неабходныя для рэнтабельнасці справы. Для таго ж, каб прадаваць прыбор, распрацаваны беларускімі навукоўцамі, на сусветным рынку, неабходна яго тэхнічная аптымізацыя і пастаўка камплектуючых з-за мяжы. Нямецкіх прадпрымальнікаў гэта не спыняе. "Добрыя ідэі, — кажуць яны, — заўжды добра прадаюцца."

— **Наколькі бяспечна, на вашу думку, укладаць грошы тут, у Беларусі? Ці спрабавалі вы ажыццявіць нешта падобнае ў іншых краінах былога СССР?** — гэтыя пытанні карэспандэнт "Беларускага універсітэта" адрасаваў Вольфгангу Вінклеру.

— Так, міжнародны вопыт у выглядзе вялікай сеткі нашых прадстаўнікоў на сусветным рынку ёсць. Супрацоўнічаем з Кіевам, Тальяці, дзе ў абсталяванне цэнтра намі ўкладзена 7 млн. нямецкіх марак.

*(Заканчэнне на 7-й стар.).*

У самым пачатку лютага, калі ў Мінску дзьмулі халодныя зімовыя вятры і падаў мокры снег, мы, пяцёра вучняў з Ліцэя БДУ разам з нашым выкладчыкам, адправіліся ў адно з самых гарачых месцаў на нашай планеце.

# ГАРАЧАЯ КРОПКА НАШАЙ ПЛАНЕТЫ

## ЛІЦЭІСТЫ ПАБЫВАЛІ Ў ЗНАКАМІТЫМ ГОРАДЗЕ МАЯМІ Ў СПЯКОТНЫМ ШТАЦЕ ФЛАРЫДА

А пабывалі мы ні многа ні мала ў знакамітым горадзе Маямі, што знаходзіцца на самым поўдні ЗША, у спякотным штаце Фларыда.

Апынуліся беларускія ліцэісты ў амерыканскіх субтропіках дзякуючы Інфармацыйнаму агенцтву ЗША, якое вось ужо другі раз запрасіла Ліцэй Беларускага дзяржаўнага універсітэта прыняць удзел у праграме міжнароднага абмену паміж школамі СНД і ЗША.

Свае дзверы перад намі расчыніла адна з самых прэстыжных школ Маямі — Корэл Гэйблз Хай Скул. Цэлы месяц нас грэлі сцены гасцінных дамоў пяцярых вучняў з Корэл Гэйблз: Эйдрыяна Бакарызы, Кікі Парсанс, Дэвіда Ролера, Нікаласа О'Мэлі і Чарлі Парсанса — і іх настаўніка Джорджа Ролера. Мы павінны прызнаць, што яны пастараліся на славу, каб зрабіць наш візіт у Маямі незабыўным.

Мноства разнастайных уражанняў прыводзіць нас у разгубленасць: з чаго пачаць? Увогуле, паездка ў Маямі была настолькі надзвычайнай, што з дарам мовы ў нас, падобна, на нейкі час будуць невялікія праблемы. Пачнем, мабыць, з таго, што скажам — праграма нашага знаходжання ў Маямі была неверагодна насычанай. У ёй былі як афіцыйныя мерапрыемствы, так і мноства забаў у стылі Маямі. Што значыць "у стылі Маямі" — вы зразумееце крыху пазней. А пакуль — крыху пра падзеі, якія вымушалі нас быць сур'ёзнымі.

Мабыць, не засталося фактычна ніводнага ўплывовага палітычнага дзеяча ў Фларыдзе, якому б мы не паціснулі руку за гэты месяц. Абедаць у рэстаране з намі пагадзілася сама Іліяна Рос-Лейтнен — прадстаўнік Фларыды ў Федэральным кангрэсе ЗША. Гэта адкрытая, добразычлівая і, што галоўнае, бязмежна простая жанчына — адна з самых папулярных і славутых персон у Фларыдзе. Яе пазнаюць на вуліцах. Можна толькі ўявіць, наколькі мы былі ўзрадаваныя, калі яна так ахвотна адгукнулася на нашае запрашэнне. І гэта з яе графікам!..

Зычліва сустрэлі нас у офісе другога кангрэсмена ад Фларыды — сенатара Боба Грэма. Не менш цёплы прыём быў арганізаваны ў штаб-кватэры Узброеных Сілаў ЗША — той іх часткі, якая адказвае за бяспеку Амерыкі на поўдні. Тут нас сустрэў генерал Чарлз Вілхельм. З размовы з ім мы даведаліся, што ў гэтага ўплывовага чалавека толькі два начальнікі — Прэзідэнт ЗША і Сакратар абароны. Не цяжка зразумець, наколькі вялікім быў гонар, які аказаў нам трэці чалавек Амерыкі, запрасіўшы да сябе ў офіс. Але радасць ад 15-хвіліннай сустрэчы з генералам Вілхельмам была выклікана не колькасцю зорак на яго пагонах, а яго стаўленнем да нас. Ён, як і Іліяна Рос-Лейтнен, застанецца для нас сімвалам палітычнага дзеяча, чый статус ні на ёту не можа змяніць яго паводзіны, яго стаўленне да іншых людзей. Прадстаўнікі ўлады, з якімі нам давялося сустракацца, абсалютна пазбаўлены ўсялякай фанабэрыстасці ад усведамлення сваёй значнасці. У жыцці яны вельмі простыя, як і тыя, ад чыйго імя яны прымаюць свае рашэнні.



Дарэчы, былі мы і на пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў Кангрэса Фларыды, бачылі, як прымаюцца законы. І гэты наш вопыт яшчэ больш пераканаў нас, наколькі адкрытыя і даступныя многія структуры амерыканскага грамадства для звычайных грамадзян. Хочаш ведаць, як працуюць тыя, за каго ты аддаў свой голас, — прыйдзі і паглядзі. І гэта датычыцца не толькі палітычных структур, а ўсяго жыцця супольнасці ў цэлым. Мы наведалі самыя розныя месцы ў Фларыдзе: паліцэйскі пастарунак і пажарную станцыю ў Маямі, славутую фірму "Архітэктоніка" і кампанію "Келі Трактар", шпіталь Саўс Маямі Хоспітал і пасажырскі лайнер "Ройел Карыбіен", — усё гэта стала магчымым не толькі праз намаганні нашых гасцінных гаспадароў. Мы ніколі б не змаглі даведацца так багата аб жыцці амерыканскай супольнасці, каб не яе адкрытасць, накіраванасць на дыялог.

Зрэшты, далёка не ўвесь месяц мы хадзілі "ў гальштуках". Як-ніяк, а знаходзіліся мы ўсё ж такі ў Маямі. А калі так, то абавязкова павінны быць шыкоўныя машыны, прыгожыя жанчыны і мужчыны, дарагія атэлі, пальмы і спёка. І ўсё гэта было. У той час, як у Мінску выпаў тоўсты слой снегу, мы загаралі пад сонцам Фларыды на беласнежным пяску Маямі-Біч. Мы купаліся ў салёным Атлантычным акіяне і нават плавалі між каралаў і рознакаляровых трапічных рыб, да якіх можна было дакрануцца рукой. Былі ў індзейскай вёсцы з мноствам сапраўдных кракадзілаў. Аднаго з іх пашчасціла трымаць у руках. І абсалютна неперадавальным было ўражанне ад наведвання Свету Мятлікаў, дзе пад спецыяльным купалам сабралі найпрыгажэйшых мятлікаў з тропікаў. А яшчэ там жывуць раскошныя папугаі, якія, пабачыўшы ежу ў чалавечых руках, смела і нават нахабна сядаюць на цябе, патрабуючы абеду. Не прамінулі мы і грандыёзны дэльфінарый Маямі, дзе здымаўся фільм пра Фліпера. Апрача дэльфінаў, мы пабачылі там марскіх ільвоў, кіта, велізарных марскіх чарапах, крабаў нейкіх ашаламляльных колераў і мноства ўсяго рознага.



Нават слова "экзотыка" не можа перадаць нашыя ўражанні ад усяго перажытага. Мы сутыкнуліся з тым, пра што раней маглі хіба што чытаць у кнігах, бачыць па тэлевізары ці проста марыць.

Але самае захапляльнае было яшчэ наперадзе. Паездка на мыс Канаверал у Касмічны цэнтр імя Кенедзі, а потым... у Дыснейуолд. На мысе Канаверал нам прыадкрылі таямніцы, якімі заўжды былі ахутаны касмічныя праграмы. Мы на ўласныя вочы пабачылі славутую стартавую пляцоўку, з якой адлятаюць усе амерыканскія "шатлы". Бачылі і сам "шатл" і нават былі ўнутры яго. Была і бліскучая магчымасць убачыць, як будуецца Міжнародная касмічная станцыя — праект XXI стагоддзя.

Але нават "шатлы" адышлі для нас на другі план, калі мы на два дні прыехалі ў Дыснейуолд — мару кожнага дзіцяці, а можа і дарослага. Там мы трапілі у казку, зусім забыўшыся на існаванне рэальнага свету. Пакаталіся на амерыканскіх горках, паціснулі руку Мікі Маўсу, нас папалохалі ў Доме Прывідаў... Не, усяго ўсё адно не распавядзеш. Гэтыя два дні можна апісаць толькі адным словам — казка! Чароўная казка, у якую лёгка было паверыць там, у Амерыцы, але ў якую так цяжка верыцца зараз.

Не верыцца, што ўсё гэта адбылося з намі. Што сапраўды была гэтая дзіўная паездка ў выдатную краіну — Амерыку. Пабачыць яе многія з нас марылі заўжды. І нашая мара здзейснілася. Але ад гэтага яна не перастала быць марай. Амерыка паранейшаму застаецца загадкай і прываблівае нас. А ва ўспамінах — паўстае цудоўным казачным краем. І не толькі таму, што там растуць прыгажуні-пальмы, цэлы год грэе шчодрае сонца і плёскаецца блакітны акіян.

Аднак сумаваць нам пакуль што рана: у красавіку адбудзецца візіт у адказ з Корэл Гэйблз Хай Скул у Беларусь. Мы старанна рыхтуемся да прыезду сваіх сяброў і не сумняемся, што гэтая частка нашага абмену будзе не менш цікавай.

Мы разумеем, што Ліцэю БДУ і нам, яго вучням, пашчасціла ажыццяўляць каласальную ідэю, якой з'яўляецца абмен паміж нашымі краінамі. Мы ўпэўнены, што пасябраваўшы, даведаўшыся болей адзін пра аднаго, пазбыўшыся некаторых стэрэатыпаў, мы, беларусы і амерыканцы, зрабілі свой уклад у тое, каб паміж дзвюма нацыямі на планеце было больш узаемаразумення і даверу.

*Святлана БАРЭКА,*
*выкладчык Ліцэя БДУ,*
*Павел ЗАЛУЦКІ,*
*Аляксандра КАЗЛОЎСКАЯ,*
*Аляксандр КІСЕЛЬ,*
*Аляксандр КРУКАЎ,*
*Іван ШАЛЯСТОВІЧ,*
*навучэнцы 11-х класаў Ліцэя БДУ*

# АБІТУРЫЕНТУ-99

Цэнтр інфармацыйных тэхналогій, фонд праграмных сродкаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта запрашаюць 6-8 красавіка 1999 года прыняць удзел у выставе-семінары праграмных сродкаў і спецыяльнай літаратуры "Абітурыент-99".

Выстава будзе працаваць па трох накірунках:

**Аўтаматызацыя работы прыёмнай камісіі.**

Цэнтр інфармацыйных тэхналогій прадставіць новы сеткавы праграмны комплекс "Абітурыент БДУ", прызначаны для аператыўнага забеспячэння поўнай і дакладнай інфармацыяй прыёмнай камісіі, рэктара, дэканаў аб працэсе набору студэнтаў на першы курс. Сістэма дазваляе атрымаць інфармацыю аб кантынгенце паступаючых, аб ходзе ўступных экзаменаў, аб выніках прыёму.

Фонд праграмных сродкаў прапануе таксама ўвазе наведвальнікаў выставы праграму "Абітурыент-ХТТ", прызначаную для дапамогі членам прыёмнай камісіі ў сярэдняй спецыяльнай навучальнай установе, дзе праводзяцца экзамены альбо субяседаванне па якіх-небудзь прадметах.

**Пытанні прафарыентацыі і псіхадыягностыкі.**

На другі дзень работы на семінары будуць зроблены даклады і прадстаўлены праграмныя сродкі па інфармацыйных сістэмах для прафесійнай арыентацыі абітурыентаў.

**Электронны рэпетытар.**

У гэтым раздзеле выставы абітурыентам будзе прапанаваны шырокі спектр навучальна-кантрольных праграм па матэматыцы, фізіцы, хіміі, мовазнаўстве, гісторыі, якія дапамогуць лепш падрыхтавацца да ўступных экзаменаў.

*Выстава будзе праходзіць у галоўным корпусе БДУ (пр. Ф. Скарыны, 4). Адкрыццё выставы 6 красавіка ў 10.00 у аўдыторыі 120. Тэлефон аргкамітэта 226-58-95.*

# НАВУКОВА-ТЭХНІЧНЫЯ РАСПРАЦОЎКІ БДУ

У выставачнай зале БДУ, што размешчана на першым паверсе галоўнага корпуса, пастаянна дзейнічае выстава навукова-тэхнічных дасягненняў універсітэта. Па словах загадчыцы сектара выстаў і рэкламы Валянціны Міхайлаўны Карчэўскай, штуршком для арганізацыі такой залы стала наведванне універсітэта Прэзідэнтам Беларусі ў мінулым годзе.

Выстава дзейнічае з 15 студзеня 1998 года. Сапраўды, тут ёсць што паказаць гасцям універсітэта. Падрыхтаваны каталогі навукова-тэхнічных распрацовак Белдзяржуніверсітэта на рускай і англійскай мовах.

Супрацоўнікі сектара выстаў і рэкламы не толькі экспануюць дасягненні БДУ, але і актыўна прадстаўляюць універсітэт на шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных выставах. У мінулым годзе БДУ прыняў удзел у 27 выставах, сярод якіх 21 ладзілася ў Беларусі, 5 — у далёкім замежжы, 1 — у Расіі. Усяго было прадстаўлена 478 экспанатаў. На ўсіх выставах яны карысталіся нязменнай увагай. Па 122 распрацоўках вядуцца перамовы па продажы, усяго ж у мінулым годзе было заключана 53 здзелкі.

Універсітэт удзельнічаў у VI Міжнароднай спецыялізаванай выставе і семінары "Ахова здароўя-99", што праходзіла з 16 па 19 сакавіка гэтага года ў Нацыянальным выставачным цэнтры "Белэкспа" (вул. Я.Купалы, 27). Было прадстаўлена каля 30 экспанатаў. Таксама ёсць намер прыняць удзел у V Міжнароднай спецыялізаванай выставе, якая будзе праходзіць у Нацыянальным выставачным цэнтры з 11 па 14 мая.

А супрацоўнікі і студэнты, якія наведаюць выставачную залу БДУ, не пашкадуюць — нашаму універсітэту сапраўды ёсць чым ганарыцца.

*Таццяна КУХАРЧУК*



## ЛЕТАМ — У ШКОЛУ

Упраўленне міжнародных сувязей валодае інфармацыяй аб курсах у летняй школе ў галіне правоў чалавека, арганізаваных Саветам Еўропы. Курсы будуць працаваць у ліпені-верасні ў розных краінах Еўропы. Праграма наведвання ўключае ў сябе візіт у Савет Еўропы.

Так, 11-17 ліпеня пройдзе Міжнародная сесія па правах чалавека і дактрыне міру ў Жэневе, арганізаваная Міжнародным навучальным цэнтрам па правах чалавека і дактрыне міру.

З 23 жніўня па 3 верасня будуць дзейнічаць інтэнсіўныя курсы па міжнароднай абароне правоў чалавека ў Фінляндыі, арганізаваныя Інстытутам па правах чалавека ў Turku/Abo.

З 3 па 12 верасня — курсы па Міжнароднай абароне правоў чалавека ў Польшчы, арганізаваныя Пазнаньскім Цэнтрам па правах чалавека.

З 11 па 19 верасня — IX Міжнародная летняя школа па правах чалавека ў Варшаве, якую ладзіць Хельсінкскі фонд па правах чалавека.

Па больш падрабязную інфармацыю звяртайцеся ва Упраўленне міжнародных сувязей. Апошні тэрмін падачы дакументаў — 1 красавіка 1999 года.

## ПРАКТЫКА У ШВЕЙЦАРЫІ

Вышэйшая школа горада Санкт-Галена і студэнцкая арганізацыя AIESEC мае магчымасць запрасіць 12 студэнтаў на 10 месяцаў для праходжання навучання і практыкі ў Швейцарыі. Больш падрабязную інфармацыю можна атрымаць ва Упраўленні міжнародных сувязей альбо ў Інтэрнэце па адрасе: http://www.stud.unisg.ch/.~AIESEC/projects/mapow.

## ЗАПРАШАЕ ЛАТВІЙСКАЯ РЭСПУБЛІКА

Пасольства Латвійскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь паведамляе, што з 24.07.99 па 15.08.99 міжнародная летняя Балтыйская школа пры Універсітэце горада Відземэ праводзіць заняткі па гісторыі, палітыцы, праве, турызме, музыцы, мастацтве балтыйскага рэгіёна, а таксама латышскай літаратуры і мове.

Дакументы прымаюцца да 1 красавіка 1999 года. Больш падрабязную інфармацыю можна атрымаць ва Упраўленні міжнародных сувязей па адрасе: вул. Бабруйская, 7, пакой 416, тэл. 220-88-21.

## МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

# ДОБРЫЯ ІДЭІ ДОБРА ПРАДАЮЦЦА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й, 4-й стар.).*

Ідэя з вытворчасцю мікрасхемы для абарончай маскі — першы крок для будучай сур'ёзнай працы ў Беларусі. Я не баюся прыходзіць працаваць на беларускі рынак. Я не палітык, а прадпрымальнік. Дарэчы, пакуль што мы нічым не рызыкуем. Фінансавыя траты, якія патрабуюцца для вырабу ўзору, невялікія. Потым арганізуем тут вытворчасць па зборцы прадукта з пастаўкай танных камплектуючых з-за мяжы. Гэта дасць магчымасць Беларусі зарабіць валюту, будзе спрыяць яе інтэграцыі ў эканамічную прастору Заходняй Еўропы. Гэта важна і для нас.

**— Чаму вас так хвалюе пытанне аб магчымасці папаўнення валютных запасаў Беларусі?**

— Мы хацелі б паспрыяць станаўленню вашай эканомікі, маючы, вядома ж, і свой інтарэс.

**— І перш за ўсё вас прываблівае танная рабочая сіла?**

— Гэта лагічна. Калі гэты праект запрацуе, будзем пашыраць сферу дзейнасці. Наша фірма працуе ў некалькіх накірунках. Гэта навучанне зварачнай справе, арганізацыя курсаў павышэння і пацвярджэння кваліфікацыі ў галіне працы на найноўшай зварачнай тэхніцы пры падтрымцы Нямецкага саюза па зварачнай тэхніцы, прафесійная адукацыя і перакваліфікацыя, кансалтынг, вытворчасць рэкламных стэлажоў і вітрын для буйных супермаркетаў.

**— Да таго, як стаць прадпрымальнікам, вы былі інжынерным работнікам на адным з прадпрыемстваў ГДР. У чым сакрэт таго, што ваша фірма апынулася сярод тых, хто вытрымаў жорсткую канкурэнцыю з заходнегерманскімі вытворцамі?**

— Вытрымалі недзе каля 70 працэнтаў утвораных тады прадпрыемстваў. Ніякага досведу рыначных зносін у мяне не было. Год даводзілася навучацца азам эканомікі. Але былі добрыя ідэі і надзейныя партнёры. Вось чаму мы даволі хутка сталі на ногі. А палове шостай раніцы я быў на фірме і сыходзіў толькі пасля дзесяці вечара. Яшчэ, напэўна, справа ў правільна абраным падыходзе. Быць на ўзроўні апошніх дасягненняў і заўжды на крок наперадзе.

Мяркуючы па ўсім, нямецкі прадпрымальнік Вінклер сапраўды вырашыў абаснавацца ў Беларусі сур'ёзна і надоўга. Дзелавы падыход да супрацоўніцтва з беларускімі вытворцамі ён прадэманстраваў і ў час наведвання НДІ зваркі, а таксама МАЗа. У якасці падарунка ён прапанаваў аўтазаводу 11 тон электродаў для элетразваркі (гэтай колькасці дастаткова прадпрыемству для забеспячэння бесперапыннай працы на працягу квартала). Не менш прывабнымі выглядаюць для абодвух бакоў прапановы спадара Вінклера правесці стажыроўку для групы зваршчыкаў у прыватнай акадэміі "Сімсан" і прадаць мінскаму аўтазаводу на ўзаемавыгодных умовах найноўшых узораў зварачнай тэхнікі для навучання на ёй зваршчыкаў усіх прадпрыемстваў краіны.

*Марына АВЕРКІНА*

## АФІША

# МЫ ПАЧЫНАЕМ КВЗ

У актавай зале галоўнага корпуса Беларускага дзяржаўнага універсітэта 29-30 сакавіка пройдуць гульні 1/8 фінала камандаў Клуба вясёлых і знаходлівых.

29 сакавіка ў 18.00 сустракаюцца каманды ФЭФ-2, геафак-2, "Аддзел кадраў", радыёфізічнага факультэта, ПТВ № 71, "Энерджайзер".

30 сакавіка таксама ў 18.00 на сцэну выйдуць каманды факультэта міжнародных адносін "2/10", філфака, горада Віцебска, юрыдычнага факультэта, горада Навагрудка, ФПМ-2.

Білеты можна набыць у дырэкцыі па справах культуры (тэл. 220-42-07).

## НЕ ПРАМІНІЦЕ

# СУПЕР-МАДЭЛЬ БЕЛАРУСІ



Не так даўно прайшоў тыдзень моды ў Лондане. 44 дызайнеры паказвалі на ім свае калекцыі вясна-лета-99. І ў кожнай з іх любы мог знайсці нешта для сябе. Беларусь, зразумела ж, не цэнтр сусветнай моды, але і нашы дзяўчаты нейкім чынам дасягаюць таго, што выглядаюць прывабна, сучасна, модна і элегантна. І няхай няма ў іх пакуль аблягаючай металічнай сукенкі, як у Джодзі Кід (што на здымку), затое шанц стаць супер-мадэллю Беларусі паявіўся.

26 сакавіка ў 14.00 Дом афіцэраў запрашае на сумесны праект агенцтва Сашы Варламава і Беларускага дзяржаўнага універсітэта "Universalmodels" — конкурс супер-мадэляў Беларусі.

## СПОРТПЛЯЦОЎКА

* * *

*На першынстве Маскоўскага раёна па шахматах каманда БДУ ў саставе А.П. Кузнечыка (загадчык абсерваторыі БДУ), А.Г. Раманава (аспірант фізічнага факультэта, майстар спорту міжнароднага класа), А.А. Ягорава (дацэнт кафедры фізфака) заняла 1 месца сярод 18 каманд.*

* * *

Прайшоў чарговы этап спартакіяды сярод інтэрнатаў БДУ. На гэты раз студэнты спаборнічалі ў шахматах. На першым месцы інтэрнат № 4, на другім — № 7, на трэцім — № 2.

* * *

*Прайшлі спаборніцтвы па настольнаму тэнісу ў рамках першынства спартакіяды сярод інтэрнатаў студэнцкага гарадка БДУ. Першае месца заняла каманда інтэрната № 10, другое — інтэрната № 7, трэцяе — інтэрната № 2.*

### Зводная табліца спартакіяды сярод інтэрнатаў студэнцкага гарадка БДУ ў 1998-99 навучальным годзе

| | Інтэрнат № | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2 | 3 | 4 | 5 | 7 | 9 | 10 |
| Від спаборніцтваў | Каманднае месца / Заліковыя ачкі | | | | | | |
| Гіравы спорт | 2/4 | 5/1 | 1/6 | - | 3/3 | - | 4/2 |
| Баскетбол | 1/6 | 3/3 | 5/1 | - | 2/4 | - | 4/2 |
| Настольны тэніс | 3/3 | 4/2 | 5/1 | 6/0 | 2/4 | - | 1/6 |
| Шахматы | 3/3 | - | 1/6 | 5/1 | 2/4 | - | 4/2 |
| | | | | | | | |
| Выніковае месца па чатырох відах | 1/16 | 5/6 | 3/14 | 6/1 | 2/15 | - | 4/12 |

ВЫ ЧУЛІ?

## ПАДАРУНАК

Набліжаецца свята Уваскрасення Хрыстова (Вялікдзень), якое праваслаўныя вернікі будуць адзначаць 11 красавіка.

Каштоўныя падарункі для родных і блізкіх, якімі могуць стаць па-мастацку афарбаваныя яйкі, карціны, імянныя абразы, свечы, можна, дарэчы, набыць у краме "Праваслаўная кніга", што знаходзіцца па вуліцы Берасцянскай, 17.

Вельмі патрэбным падарункам можа стаць у гэты дзень прыгожа аформленая кніга духоўнага зместу (такіх у краме больш за 700 назваў), абразок, каляндар з відамі храмаў, набор паштовак альбо касета з запісамі духоўнай музыкі.

Духоўныя песнапенні іераманаха Рамана ў выкананні Жаны Бічэўскай, паэтычныя і ўзнёслыя, даюць магчымасць дакрануцца да праваслаўных святыняў, падыхаць чыстым і празрыстым паветрам манастыроў, паспрабаваць вады з сапраўдных нескаламучаных крыніц. Як адкрыла для сябе свет веры, распавядае сама пявіца.

Можна падарыць і "Закон Божы". Гэтая кніга зацікавіць адначасова і бацькоў, і дзяцей. Яна дапаможа знайсці адказы на шматлікія пытанні пра веру хрысціянскую, якая спакон веку была асновай жыцця нашых продкаў-беларусаў.

*Эла ОЛІНА*
*Падрыхтавана "Праваслаўнай ініцыятывай"*

СВЯТА

## ВЯЛІКДЗЕНЬ

Да Вялікадня на вёсцы рыхтаваліся заўсёды вельмі старанна. Прыборка хаты ішла надзвычай рупліва. Вялікдзень лічыўся самым вялікім святам.

Мыццё хаты пачыналася з серады. Усё выносілася на двор. Сеннікі набівалі свежай саломай. Падлогу мылі дабяла. У Чысты чацвер перад Вялікаднем памытую падлогу засцілалі саломай. Салома ў хаце ляжала аж да суботы. У суботу апоўдні салома прыбіралася. Замест яе клаліся лапкі. Усе работы перад Вялікаднем завяршаліся ў суботу да паўдня. Пасля мыліся ў лазні. Елі ўсё толькі поснае.

Вечарам і на ўсяночнай у царкве званіў толькі званар. Выбіваў звонам гукі накшталт "Да нас, да нас, да нас ідзіце".

У кожнай сям'і да Вялікадня гатуецца свянцонае. Стол пакрываецца белым чыстым абрусом, і на ім ставіцца ўсялякая ежа: яйкі, масла, сыр, каўбасы, шынка, смажаная цяляціна, смажаная ялавічына, парася, а таксама бабы, куліч.

Усе гэтыя стравы нясуць для асвячэння ў царкву, склаўшы яе ў кошыкі да велікоднай ютрані. На велікодным богаслужэнні імкнуцца пабываць усе, за выключэннем старых, пад нагляд якіх пакідаюць свае хаты гаспадары.

Вярнуўшыся з царквы дадому, беларус у сваёй сям'і разгаўляецца свянцонымі яйкамі і кулічом, а затым каштуе ўсе іншыя стравы.

ТРАДЫЦЫІ

## ВЕЛІКОДНАЕ ЯЙКА

Звычай мяняцца на Вялікдзень чырвонымі яйкамі быў запачаткаваны вельмі даўно. Яйка сапраўды самы зразумелы сімвал уваскрошання: у ім тояцца скрытыя жыццёвыя сілы.

У часы паганства яйка амаль ва ўсіх народаў было як бы адлюстраваннем сілы прыроды. Увесь Сусвет, уяўлялі паганцы, выйшаў з яйка. У паганцаў, а таксама іудзеяў быў звычай — з'яўляючыся да важнай асобы, прыносіць што-небудзь ад сябе як даніну павагі і любові.

Бедныя людзі звычайна прыносілі яйкі хатніх птушак. Існуе паданне, што роўнаапостальная Марыя Магдалена, з'явіўшыся да рымскага імператара Тыберыя, перш чым распачаць прапаведзь хрысціянства, паднесла яму чырвонае яйка як сімвал, які тлумачыць вучэнне.

Так і мы перанялі гэты звычай ад святых айцоў, якія ў сваю чаргу захавалі яго з самых апостальскіх часоў.

*Падрыхтавана "Праваслаўнай ініцыятывай"*

ЗАХАПЛЕННІ

## УДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У БАРДАЎСКІХ КОНКУРСАХ Я ПАЧАЛА З 13 ГАДОЎ

*Марыя Садоўская — лаўрэат III ступені конкурсу бардаўскай песні "Сярэбраныя струны-98", які праводзіўся сярод інтэрнатаў БДУ. Ёй 17 гадоў, і вучыцца яна на першым курсе факультэта журналістыкі. Акрамя спеваў, Марыя захапляецца вывучэннем замежных моў (англійскай, польскай і эсперанта), а вольны час аддае яшчэ і працы ў Беларускай Асацыяцыі клубаў ЮНЕСКО. Марыя таксама з'яўляецца пазаштатным карэспандэнтам газеты "Переходный возраст" і юнкорам газеты "Комсомольская правда в Беларуси".*

**— Марыя, ці спадабалася табе свята бардаўскай песні?**

— Для мяне гэта было напамінам пра тыя канцэрты бардаўскай песні, якія адбываліся ў мяне дома, у Гродне. Я была вельмі ўзрушана, хвалявалася, і мне было вельмі цікава пачуць, як спяваюць студэнты нашага універсітэта.

**— Якія новыя песні ты пачула на вечары?**

— Для мяне амаль усе песні былі новымі, акрамя, канешне, песень Ганны Панкратавай, якая ўдзельнічала ў канцэрце ў якасці госця і з'яўляецца вядомым у Беларусі бардам.

**— Ці можна было песні ўдзельнікаў конкурсу, на тваю думку, назваць добрымі з пункту гледжання мастацкага ўзроўню?**

— Мне вельмі цяжка штосьці казаць катэгарычна, але асабіста я як аўтар, пачуўшы спевы некаторых са сваіх калег, знайшла для сябе шмат новага.

**— Колькі гадоў ты спяваеш?**

— Удзельнічаць у бардаўскіх конкурсах я пачала з 13 гадоў, але тады я яшчэ выконвала чужыя творы (песні вядомых расійскіх бардаў), а штосьці сваё я пачала ствараць у 15 год, і дзесьці тады ў мяне было некалькі ўласных выступленняў у Гродне.

**— Ці не спрабавала ты граць на электрагітары?**

— Спрабавала, але гэта было ў вузкім коле сяброў яшчэ тады, калі я займалася ў эстраднай студыі.

**— Ну і як, табе спадабалася?**

— Мне, можа, і спадабалася, але тыя, хто былі побач, разбегліся, а потым папрасілі больш такога не рабіць.

**— Марыя, калі не сакрэт, хто прыслаў табе "валянцінку" на свята ўсіх закаханых?**

— Я атрымала некалькі "валянцінак", але ні на воднай з іх не было подпісу.

**— І якая была твая рэакцыя?**

— Аднаму з магчымых аўтараў гэтых "валянцінак" я даслала віншаванні, і таксама без подпісу. Яшчэ не ведаю, ці здагадаўся ён.

**— А якое месца займае каханне ў тваіх песнях?**

— Напэўна, я не буду арыгінальнай, калі скажу, што каханне — гэта галоўнае, гэта тое пачуццё, якое акрыляе мяне і дапамагае ствараць песні. Але не адно яно...

**— Скажы, калі ласка, якія ў цябе бліжэйшыя планы на будучыню?**

— Пасля выступлення я атрымала запрашэнне на ўдзел у рэспубліканскім конкурсе бардаўскай песні, які пройдзе ў красавіку гэтага года. Напэўна, я прадстаўлю свае новыя творы, якія дагэтуль не спявала для шырокай аўдыторыі.

*Гутарыў*
*Дзмітрый ГАРЭЛІКАЎ*


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*
*Ум. друк. арк. 1*
*Падпісана ў друк у 12.00*

*25 САКАВІКА*
*Зак. 238.*
*Т. 1000 экз.*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 2206827.*

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*

*Камп'ютэрная вёрстка А. Крывадубскай*